ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_________У.У. Рыжкоў
«___» чэрвеня 2015г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення ўступных іспытаў у ліцэй па вучэбнаму прадмету «Беларуская мова»

Дата правядзення – 15 чэрвеня
Час выканання – 45 хв.

**След на зямлі**

Пад словамі "след на зямлі" мы разумеем не адбітак босай нагі на пяску, а нейкія ўчынкі, справы чалавека, па якіх яго маглі б помніць. Існуе ж мудрае выказванне, што чалавек пражыў жыццё не дарэмна, калі пабудаваў дом, пасадзіў дрэва, выгадаваў сына. Яшчэ чалавек павінен пакінуць сваім нашчадкам цудоўны свет, у якім яны маглі б жыць і гадаваць сваіх дзяцей.

Усё жывое імкнецца да сонца. Без сонца не могуць існаваць ні жывёлы, ні птушкі, ні людзі. Жыццё на зямлі наогул немагчыма без сонца. Для яго імкненне да сонца – гэта імкненне да сваёй мэты, жаданне яе здзейсніць.

Зорка ці метэарыт, згараючы, пакідаюць свой след. І чалавек не павінен бясследна знікнуць з Зямлі. Які след пакіне пасля сябе сённяшні малады чалавек, залежыць ад яго самога. (125 слоў)

*Паводле В.Старычонка*

*Дадатковае заданне*

**1 варыянт**

1. Выпішыце з першага сказа адно слова, напісанне якога адпавядае вымаўленню.

2. Дайце марфалагічную характарыстыку слова *выгадаваў* (з другога сказа).

3. Знайдзіце ў другім абзацы просты ўскладнены сказ (пазначце *) і запішыце, чым ён ускладнены.

4. Пабудуйце гарызантальную схему першага сказа і вызначце яго від па будове.

5 Перакладзіце на рускую мову: *пакінуць нашчадкам цудоўны свет.*

**2 варыянт**

1. Выпішыце з першага сказа адно слова, напісанне якога не адпавядае вымаўленню.

2. Дайце сінтаксічную характарыстыку слова *помніць* (з першага сказа).

3. Знайдзіце ў другім абзацы просты ўскладнены сказ (пазначце *) і запішыце, чым ён ускладнены.

4. Пабудуйце вертыкальную схему другога сказа і вызначце яго від па будове.

5. Перакладзіце на рускую мову: *імкненне да сваёй мэты.*